**Чараўко В.У.**

# ТЭСТАМЕНТЫ ЯК КРЫНІЦА ПА ПАХАВАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ ШЛЯХТЫ І МЯШЧАН ПОЛАЦКАГА І ВІЦЕБСКАГА ВАЯВОДСТВАЎ XVI–XVIII СТСТ.[1]

У XVI–XVIII стст. у асяроддзі шляхты і мяшчан Вялікага Княства Літоўскага атрымала пашырэнне практыка складання завяшчанняў-тэстаментаў. Асноўны змест тэстаментаў складалі распараджэнні маёмаснага характару, якія датычыліся перадачы ў спадчыну зямельных уладанняў і рухомай маёмасці. Шэраг завяшчанняў ўтрымлівае неабавязковыя, але інфарматыўныя пажаданні адносна абставін пахавання. Такія тэстаменты з'яўляюцца гістарычнай крыніцай па пахавальных традыцыях насельніцтва Беларусі новага часу. Намі выкарыстана 59 тэстаментаў, аўтары якіх зрабілі распараджэнні наконт падрыхтоўкі ці працэдуры свайго пахавання. Завяшчанні належалі прадстаўнікам шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў, якія пражывалі на тэрыторыі Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у другой палове XVI–XVIII ст. Названыя тэстаменты апублікаваны ў часопісе «Руская даўніна» [5], 19, 21, 22, 24–27 і 31 тамах серыйнага выдання дакументаў «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы» [6–13], калектыўнай манаграфіі «Полацк» [15], зборніку «Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст.» [15], а таксама ў якасці дадаткаў у артыкулах В. У. Галубовіча [2], М. Ю. Гардзеева [4] і Н. У. Сліж [3].

Інфарматыўнасць тэстаментаў як крыніцы па пахавальных традыцыях заключаецца ў некалькіх аспектах. Па-першае, знакавым з'яўляецца сам факт дакументавання **пажаданняў тэстатара адносна пахавальнай цырымоніі**. Фактычна, гэта азначае ўдзел аўтара завяшчання ў падрыхтоўцы да яе. Паводле этнаграфічных звестак, занатаваных у Віцебскім павеце ў XIX ст., сяляне перад смерцю рабілі вусныя распараджэнні, у тым ліку адносна абставін свайго пахавання [17, с. 507, 510]. Гэта суадносіцца з аналагічнай інфармацыяй шляхецкіх і мяшчанскіх тэстаментаў. Пажаданні нямоглага ці хворага аб абставінах ўласнага пахавання могуць быць часткай пахавальнай практыкі, пашыранай на Беларускім Падзвінні сярод усіх саслоўных груп.

---

[1] Работа выканана ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. (падпраграма 12.1. «Гісторыя і культура», заданне 1.1.02. «Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў IX – пачатку XXI ст.: крыніцазнаўства, гістарыяграфія, антрапалогія і іншыя спецыяльныя даследаванні», навукова-даследчая работа «Фарміраванне антрапалагічнага складу і адаптыўнага статуса насельніцтва Полацкага Падзвіння ў XI–XIX стст.»).

Па-другое, распаўсюджанай з'явай было **вызначэнне месца пахавання**. Найбольшую варыятыўнасць дэманструюць шляхецкія тэстаменты. Шляхта пераважна жадала быць пахаванай у храмах і капліцах, на прахрамавых могілках, часта – ва ўласных уладаннях [3, с. 33–34; 8, с. 239, 273; 13, с. 66]. У апошнім выпадку месцам спачыну маглі стаць не толькі могілкі, але ўвогуле любое месца, якое спадабалася ўладальніку. Напрыклад, Лука Аўсеевіч жадаў быць пахаваным «на грунце маім Мядзеленскім, на гары, за сажалкай, пад дубам», а Андрэй Якубавіч Сівіцкі – «у маёнтку маім Добрыне..., у агародзе маім, пад дваром маім Добрынам, каля саду майго» [7, с. 452; 16, с. 203–205].

Часцей у тэстаментах фігуравалі храмы, размешчаныя на шляхецкіх землях [7, с. 144; 9, с. 239; 16, с. 225, 227]. Такія цэрквы і касцёлы будаваліся ці падтрымліваліся тэстатарамі. У шэрагу выпадкаў аўтары прама ўказвалі на гэта. Валерыян Арэхавінскі жадаў быць пахаваным «у касцёле, мною збудаваным на Мнюце», Аляксандр Косаў – у «царкве нашай Будавецкай» [2, с. 31; 10, с. 116; 11, с. 97]. Фундацыя і падтрыманне храма, абранага як месца апошняга прытулку, таксама варта разглядаць як клопат тэстатара аб падрыхтоўцы ўласнага пахавання. Шляхцянка Марына Янішэўская Дуброўская пазначыла, што абрала царкву «святога Спаса Гразінскага» загадзя [7, с. 437].

Распараджэнні мяшчан адносна месца пахавання менш варыятыўныя. Мяшчане жадалі знайсці апошні спачын на гарадскіх могілках каля храмаў або ў саміх храмах. Так, Таццяна Якаўлеўна Шараметава прасіла пахаваць яе «пры царкве Святога Багаяўлення» [4, с. 47; 15, с. 678–682]. Палачанкі Арына Лукашэвічава і Настасся Паўкова хацелі быць пахаваны ў той жа царкве Багаяўлення (Настасся Паўкова – у прытворы) [15, с. 563–564, 576–577]. Пры кафедральным (Прачысценскім) саборы ў Віцебску жадалі быць пахаваны Еўфрасіння Мікалаеўна Чарнаброўкава і Трафім Субота, на могілках прыходскай Увядзенскай царквы – Еўдакія Шыбра [6, с. 62–63, 216, 253; 7, с. 278].

Пахаванні на прыхрамавай тэрыторыі і ў храмах адрозніваліся паводле статуснасці. Больш прэстыжнымі лічыліся месцы ў храме. Яны прызначаліся для найбольш багатых кцітараў. Крыштоф Мірскі завяшчаў бернардынскаму кляштару 5 000 злотых за пахаванне ў сцяне друйскага касцёла, Ян Корсак Галубіцкі – 20 200 злотых за пахаванне ў склепе пад алтаром глыбоцкага касцёла. Для параўнання, за месца на могілках пры тым жа касцёле Разалія Корсакава ахвяравала каля 500 злотых [19, s. 16].

Пажаданні тэстатараў выконвалася не заўсёды. Напрыклад, Іосіф Корсак жадаў знайсці спачын у збудаваным ім парафіяльным касцёле ў Глыбокім. Замест гэтага ён быў пахаваны ў глыбоцкім касцёле кармелітаў, таксама ім збудаваным [18, s. 15, 20, 23]. Да парушэння завяшчанняў і да канфліктаў паміж духавенствам прыводзілі багатыя ахвяраванні. Напрыклад, у 1724 г. езуіты выкралі цела Адама Кісяля з базыльянскай капліцы і перапахавалі яго ў сваім касцёле, каб атрымаць бо́льшую суму грошай [14, с. 206].

Па-трэцяе, у некаторых тэстаментах утрымліваюцца **просьбы аб пахаванні побач з роднымі і блізкімі**, пераважна з памерлымі супругамі [7, с. 294; 8, с. 335; 10, с. 116; 12, с. 253]. Гэта сведчыць аб наяўнасці сямейных і нават радавых месцаў для пахавання, што прадугледжвала кцітарскую падтрымку храмаў некаторымі шляхецкімі радамі на працягу некалькіх пакаленняў. Напрыклад, жаданне быць пахаваным побач з «целамі продкаў» выказваў дзісненскі староста Юрый Мікалаевіч Зяновіч [5, с. 504], шляхціц Міхаіл Дзмітровіч завяшчаў пахаваць яго «пры капліцы бацькі», Тэадора Янова Прэвальская – «дзе родзічы ... ляжаць» [7, с. 144, 443]. Зямянін Грыгорый Ушацкі прасіў пахаваць яго «подле першае малжонкі» [10, с. 173]. Аналагічную просьбу меў зямянін Фёдар Аляксандравіч Сялява, прычым аб пахаванні мусіла паклапаціцца яго другая жонка [8, с. 273].

Па-чацвёртае, распаўсюджаным было **вызначэнне асоб, якім давяралася арганізацыя пахавання**. Пераважна гэта былі жонка ці муж, дзеці, зяці [15, с. 547–548, 576–577, 579, 636–637; 16, с. 203–205, 222, 227, 236, 249–250]. Радзей тэстатар звяртаўся да іншых родных, сяброў, прадстаўнікоў духавенства [6, с. 253; 7, с. 278; 11, с. 239].

Па-пятае, важным аспектам пахавальна-памінальнай практыкі былі **ахвяраванні на набажэнствы** ў час пахавання і потым, «на ратунак душы» на карысць храмаў, манастыроў, а таксама жабракоў [1, с. 54; 6, с. 134–136, 253; 12, с. 253].

Па-шостае, у тэстаментах можа адмыслова згадвацца **неабходнасць рэлігійных абрадаў**. Цікавасць выклікае не сама згадка абрадаў, ажыццяўленне якіх у XVI–XVIII стст. не выклікае сумненняў. Спецыфіку тагачаснага канфесійнага жыцця і яе ўплыў на пахавальную практыку адлюстроўвае тое, што ў некаторых выпадках размова ідзе аб «звычаях хрысціянскіх» без удакладнення канфесіі, а ў некаторых – выразна падкрэсліваецца неабходнасць ажыццяўлення цырымоніі менавіта або «водлуг закону греческого», або «з абрадамі, у касцёле святым каталіцкім прынятымі», або «обычаем збору евангелицкого» [2, с. 31; 3, с. 33–34; 5, с. 504; 8, с. 223; 13, с. 66; 16, с. 203–205, 236, 241, 246].

Па-сёмае, у адзінкавых выпадках завяшчанні ўтрымліваюць **указанні адносна пахавальнай вопраткі**, труны, цырымоніі пахавання [7, с. 305; 12, с. 253, 359; 15, с. 576–577, 678–682].

Такім чынам, тэстаменты шляхты і мяшчан Полацкага і Віцебскага ваяводстваў другой паловы XVI–XVIII ст. з'яўляюцца каштоўнай і інфарматыўнай крыніцай па пахавальных традыцыях пазначанага перыяду. Іх інфарматыўнасць прасочваецца ў шэрагу аспектаў. Сам факт складання завяшчанняў адлюстроўваў клопат тэстатара аб уласным пахаванні. Тэстаменты ўтрымліваюць указанні на месца апошняга спачыну і на пахаванне побач з роднымі і сваякамі; акрэсліваюць кола адказных за пахаванне асоб; рэгламентуюць ахвяраванні на пахаванне і памінанне, апісваюць неабходныя рэлігійныя цырымоніі, а таксама могуць змяшчаць пажаданні адносна труны і вопраткі.


1. Галубовіч, В. У. Шляхта польскага паходжання ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI–XVII стст. // Матэрыялы гіст.-краязн. канф.: (да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея) / уклад. В. Д. Краско. – Полацк : НПГКМЗ, 2008. – С. 47–55.
2. Галубовіч, В. У. Тэстамент 1623 года полацкага зямяніна Арэхавінскага / В. У. Галубовіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навуковых прац Міжнар. навукова-практ. канф., Полацк, 21–23 красавіка 2011 г. У 2 ч. Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – С. 25–32.
3. Гардзееў, М. Ю. Шляхецкія тэстаменты ў актавай кнізе полацкага магістрата за 1656–1657 гады / М. Ю. Гардзееў, Н. У. Сліж // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2013. – № 1. – С. 29–36.
4. Гордеев, М. Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого: завещание матери просветителя / М. Ю. Гордеев // Славяноведение. – 1999. – № 2. – С. 37–47.
5. Завещание Юрия Деспота Зеновича, 1582 г. // Русская старина. – 1878. – Т. XXII, вып. 7. – С. 503–511.
6. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 19. – Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1889. – XXII с. + 496 с. + XXXII с.
7. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 21. – Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1891. – X с. + 500 с. + XL с.
8. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 22. – Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1891. – X с. + 501 с. + XXXV с.
9. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 24. – Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1893. – IV с. + 516 с. + XXXVI с.
10. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 25. – Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1894. – IV с. +508 с. + XLI с.
11. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 26. – Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1895. – XXII с. + 516 с. + XXXIV с.
12. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 27. – Витебск : Губернская типолитография, 1898. – XL с. + 461 с.
13. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 31. – Витебск : Губернская типолитография, 1903. – VIII с. + 449 с. + 94 с. + XXVI с.
14. Левко, О. Н. Витебск / О. Н. Левко. – Минск : Бел. навука, 2010. – 335 с. ; ил.
15. Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.]; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Бел. навука, 2012. – 743 с. ; ил.
16. Тэстаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / склад. : А. Ф. Аляксандрава, В. У. Бабкова, І. М. Бобер. – Мінск : БелЭн, 2012. – 736 с. ; іл.
17. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. I. Ч. II. / П. В. Шейн. – СПб. : Тип. императорской Академии наук, 1890. – XXXII с.+708 с.
18. Hedemann. O. Głębokie (szkic dziejów) / O. Hedemann. – Wilno: Nakładem Oddziału Polskiego Towarzystwa Krajoznawczego w Głębokiem, 1935. – 59 s.
19. Hedemann, O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne / O. Hedemann. – Wilno : Księgarnia św. Wojciecha, 1935. – 36 s.

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЯ

***Материалы V Международной научно-практической конференции к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии***

Витебск, 25–27 апреля 2019 г.

*Витебск*
*ВГУ имени П.М. Машерова*
*2019*

УДК [930.2:94(100)+94(476.5)](062)
ББК 63.211я431+63.3(0)я431+63.3(4Беи)я431
А43

Печатается по решению научно-методического совета учреждения образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова». Протокол № 3 от 27.02.2019 г.

Редакционная коллегия:
**А.Н. Дулов** и **М.Ф. Румянцева** (отв. ред.),
**Г.Н. Яковлева** (зам. отв. ред.), **Ю.В. Дулова, Е.А. Гребень,**
**С.Г. Кащенко, В.А. Космач, А.П. Косов, С.И. Маловичко, А.В. Мартынюк,**
**И.В. Николаева, С.Н. Ходин, И.Р. Чикалова, Д.В. Юрчак**

Рецензенты:
председатель Постоянной комиссии по образованию, культуре и науке Палаты представителей Национального Собрания Республики Беларусь, член-корреспондент Национальной академии наук Беларуси, доктор исторических наук, профессор *И.А. Марзалюк* (г. Минск, Беларусь);
профессор кафедры истории России Кубанского государственного университета, доктор исторических наук, профессор *С.С. Минц* (г. Краснодар, Россия);
доцент Школы исторических наук факультета гуманитарных наук Национального исследовательского университета «Высшая школа экономики», кандидат исторических наук, доцент *Д.А. Добровольский* (г. Москва, Россия)

**А43** **Актуальные проблемы источниковедения :** материалы V Международной научно-практической конференции к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск, 25–27 апреля 2019 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А.Н. Дулов и М.Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2019. – 403 с.
ISBN 978-985-517-704-4.

Рассмотрены широкий круг проблем теории и метода источниковедения, источниковедения историографии, архивоведения, музейного источниковедения, комплексы исторических источников и отдельные источники средневековья, нового и новейшего времени.

Данное научное издание может быть полезно историкам, источниковедам, архивистам, музееведам, а также всем, кто интересуется историей и источниковедением.

**УДК [930.2:94(100)+94(476.5)](062)**
**ББК 63.211я431+63.3(0)я431+63.3(4Беи)я431**

**ISBN 978-985-517-704-4**

© ВГУ имени П.М. Машерова, 2019

# СОДЕРЖАНИЕ

## ТЕОРИЯ И МЕТОД ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЯ


***Ходин С.Н.*** Источниковедение Беларуси: XXI век ... 7
***Остряпко А.Н.*** Исторический источник в свете теории коммуникативного действия ... 10
***Богдашина Е.Н.*** Еще раз к вопросу о классификации письменных источников ... 12
***Румянцева М.Ф.*** «Остатки» и «предания»: еще раз о классификации / систематизации исторических источников ... 17
***Лукашевич А.А.*** От признания познавательной активности историка к историзации исторического источника ... 20
***Кривоносова Е.Э., Рудковский Э.И.*** Исторический факт или его интерпретация? ... 23
***Синдеев А.А.*** Феномен «европейская безопасность» как вызов современному источниковедению ... 25
***Белявский А.М.*** «Человек Бог весть откуда»: к вопросу о методах описания и интерпретации визуальных документов ... 28
***Костякова Ю.Б.*** Телевизионные исторические проекты с позиции источниковедения ... 31
***Середа Н.В.*** Археографические проблемы сохранения визуальной информации исторических источников ... 34
***Лякишева С.И.*** Историко-культурный аспект изучения фирменной бумаги русского и иностранного производства (на примере экспонатов музея-усадьбы «Ясная Поляна») ... 37
***Кащенко С.Г., Кащенко Е.С., Костригина Е.В.*** Новые методы анализа материалов главного выкупного учреждения России ... 39
***Баранова Е.В., Маслов В.Н.*** Миграция сельского населения из российских и белорусских регионов в Калининградскую область в 1946–1947 годах (из опыта разработки базы данных) ... 41
***Салениеце И.Э.*** Источниковедческий аспект устной истории: возможности и недостатки ... 44
***Николаева И.В.*** Устные воспоминания как источник по истории повседневности (на примере изучения положения населения Витебщины в послеоккупационный период Великой Отечественной войны) ... 47
***Дулова Ю.В.*** Артионим как исторический источник ... 48


## ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЕ ИСТОРИОГРАФИИ


***Исаев Д.П.*** «Историографический источник»: 50 лет осмысления понятия ... 51
***Маловичко С.И.*** Позиционирование видов историографических источников в современных учебных книгах по истории национальной истории ... 53
***Кашинская О.А.*** Практики использования историко-библиографических произведений Н.К. Шильдера как историографических источников в учебных книгах по историографии ... 56
***Булыгина Т.А.*** Историографические источники: опыт изучения. На примере стенограмм совещаний авторского коллектива книги «История народов Северного Кавказа» ... 59
***Ерохин В.Н.*** Источники в изучении истории Церкви Англии эпохи Реформации ... 61
***Чикалова И.Р.*** Изучение Персии в императорской России: роль дипломатических служб ... 64
***Майорова А.С.*** Саратовский исследователь Александр Николаевич Минх и его связи с научными обществами 68
***Мининкова Л.В.*** «Живописная Россия» как популярное географическое сочинение эпохи модерна и ее читатель ... 71
***Воробьёв В.М.*** Верхнее Подвинье в книге А.П. Сапунова «Река Западная Двина» ... 73
***Первушкин В.И.*** Роль губернских статистических комитетов в формировании научных знаний в российской провинции ... 76
***Петрова О.С.*** Витебское историческое краеведение в отражении делопроизводственных материалов Археологических съездов (1869–1914 гг.) ... 80
***Космач В.А.*** Германия 1918–1945 гг.: краткий обзор зарубежной и отечественной историографии ... 85
***Злобин С.С.*** Историографические источники для изучения постколониальных исследований (на примере колониальной Индии) ... 87
***Марцынкевіч І.А.*** Праблема сацыяльнага забеспячэння інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў гістарыяграфіі ... 90


## АРХИВОВЕДЕНИЕ. МУЗЕЙНОЕ ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЕ


***Антановіч З.В.*** Справаздачы аб стане беларускіх праваслаўных епархій як крыніцы па арганізацыі справаводства і архіўнай справы ў XIX – пачатку XX ст. (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) ... 93
***Сыцько К.В.*** Выяўленчыя матэрыялы парафіяльных архіваў Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі як гістарычная крыніца ... 96
***Касьяненко Ю.А.*** Документы рода Ковалевских в архивах Украины ... 98
***Вовк О.И.*** Сведения о Василии Каразине и его потомках в фондах Государственного архива Николаевской области Украины ... 101

*Купченко К.В., Никитина Н.В.* Архивные фонды как источник по исследованию сословных корпораций XVIII – первой половины XIX в. (на материалах Смоленского региона) ........ 105
*Агеенко Т.Н.* Из истории формирования архивного фонда ЦК КП(б)Б ........ 107
*Буевич Т.В.* Документы архивного фонда «Березинский технический участок Управления государственного речного транспорта Северо-Западного бассейна» как источник изучения Березинской водной системы в 1918–1930 гг. ........ 110
*Бондарева Е.М.* Документы по истории ветеринарного образования, хранящиеся в учреждении «Государственный архив Витебской области» ........ 113
*Генина Ю.А.* Архив Оперативного штаба рейхсляйтера Розенберга (по материалам ЦГА Украины) ........ 116
*Сулаев И.Х.* О взаимоотношениях институтов государства и мусульманского духовенства Дагестана по документам Центрального государственного архива Республики Дагестан (краткий анализ отдельных фондов) .... 118
*Кепин Д.В.* Междисциплинарность музейного источниковедения ........ 121
*Ключарева А.В.* Документальные источники по истории Первой мировой войны в Доме Л.Н. Толстого в Ясной Поляне ........ 124
*Ерешко А.Е., Ефимова Е.А.* Источниковедческая ценность фондов Музея истории детского движения Московского Дворца пионеров ........ 128
*Комаровский Е.А., Котельницкий Н.А.* Личная печать М.И. Петрункевича. К истории находки сфрагистического артефакта ........ 130
*Здасюк Н.М.* Каталогизация коллекций музеями Республики Беларусь ........ 131

## ИСТОЧНИКИ СРЕДНЕВЕКОВЬЯ И РАННЕГО НОВОГО ВРЕМЕНИ

*Николаева Н.Д.* Средневековый нарративный источник: опыт применения междисциплинарного подхода .... 134
*Нагирный В.Н.* Поляки на Руси в XI–XII веках: перспективы использования русских летописей для изучения проблемы ........ 136
*Цыб С.В., Чичинов В.А.* Датирование южнорусского похода монголов ........ 140
*Домбровский Д.* По поводу происхождения Глеба, тестя Романа Даниловича ........ 142
*Левшун Л.В.* Летописные свидетельства о почитании Креста Господня князьями полоцкого дома (к вопросу о методиках интерпретации средневековых нарративных источников) ........ 146
*Подберёзкин Ф.Д.* К вопросу об использовании «Младшей ливонской рифмованной хроники» как источника по истории войны на русско-ливонском пограничье в 40-х гг. XIV в. ........ 150
*Риер Я.А.* «Новая прусская хроника» Виганда из Марбурга как источник для изучения ранней истории Великого Княжества Литовского ........ 153
*Мартынюк А.В.* Радзивиловская летопись: соблазны и сомнения вокруг знаменитого памятника ........ 155
*Скварчэўскі Д.В.* Адлюстраванне балцкага паганства ў помніках летапісання Вялікага Княства Літоўскага .... 157
*Кудрявцева Р.-Е.А.* Русь и Литва: формирование образа в русских и белорусско-литовских летописях ........ 160
*Казакоў А.У.* Польска-літоўскія паведамленні пра бітву пад Оршай 1514 г.: дзве гісторыі адной падзеі ........ 163
*Вовина-Лебедева В.Г.* К вопросу о летописных штампах (на материале позднего летописания) ........ 165
*Войцеховская Т.В.* Трансформация летописного жанра в раннемодерную эпоху на территории Гетманщины ... 168
*Солодкин Я.Г.* Летописные версии основания «русской» Тюмени (происхождение и степень достоверности хронологических данных) ........ 170
*Черкасов Д.Н.* «Мемуары» Жака дю Клерка ........ 173
*Тогулева Е.Д., Мороз О.Л.* Статуты Великого Княжества Литовского как источники процессуального законодательства на белорусских землях ........ 175
*Сукина Л.Б.* Иконы русских святых и рецепция феномена святости в культуре XVI–XVII вв. ........ 177
*Булаты П.Ю.* Абарона Ляхавіцкай фартэцыі 1660 г. на старонках дыярыушу Я.А. Храпавіцкага ........ 180
*Пушков В.П.* Белорусы на московском печатном дворе в XVII веке (по архиву Приказа книгопечатного дела) . 182
*Еўстрацьеў А.І.* Крыніца XVII стагоддзя па гісторыі "белых русаў" з Эстонскага гістарычнага архіва ў Тарту . 185
*Сцебурака А.М.* "Стан каралеўскіх двароў Еўропы", або што ведалі французы аб Рэчы Паспалітай у канцы XVII ст. ........ 187
*Стройлова Е.С.* Книжные собрания восточноевропейских университетов XVII–XVIII вв. как источник по истории интеллектуальной жизни региона ........ 190
*Чараўко В.У.* Тэстаменты як крыніца па пахавальных традыцыях шляхты і мяшчан Полацкага і Віцебскага ваяводстваў XVI–XVIII стст. ........ 192
*Богдановича Т.В.* Статистические данные иезуитской резиденции Динабурга ........ 195
*Хроленок Е.В.* Обзор основных архивных источников демографической и социальной истории Стародубского полка (1654–1781 гг.) ........ 199
*Лагошина Н.А.* Регистрационные книги судебных иннов как источник по изучению миграции ирландских студентов-юристов в Лондон XVIII в. ........ 201
*Комиссаренко А.И.* Материалы XVI разряда Государственного архива Российской империи как источник по истории освоения южных территорий в 1720–1780-е гг. ........ 204

## ИСТОЧНИКИ НОВОГО ВРЕМЕНИ

***Шишанов В.А.*** Мемуары С.А. Шишкина как источник о биографии и деятельности первого витебского губернатора ... 208
***Посунько О.Н.*** Судебная документация последней четверти XVIII – начала XIX в.: возможности изучения истории повседневности дворянства Южной Украины ... 210
***Ильницкий К.О.*** Архивные материалы как источник истории становления дозволений на заведение типографий и законодательства о цензуре Российской империи ... 214
***Воднева Е.В.*** Докладные записки Ф.В. Булгарина как исторический источник для изучения деятельности государственных учреждений Российской империи ... 216
***Кирничанская И.С.*** Редкий документ 1834 года: свидетельство о браке староверов ... 219
***Луговцова С.Л.*** Помещики Цыбульские: нравы одной шляхетской семьи ... 223
***Даўгач Т.В.*** Інфармацыйны патэнцыял крыніц па гісторыі сістэмы кіравання вёскай беларуска-літоўскіх губерняў пасля аграрнай рэформы 1861 г. ... 226
***Владимирова Н.А.*** Материалы делопроизводства податных инспекторов Себежского уезда Витебской губернии как источник по экономическому положению населения ... 229
***Шадрина А.В.*** Церковно-приходские летописи Донской и Новочеркасской епархии как исторический источник: информационный ресурс и проблемы изучения ... 231
***Артамонова Н.Я., Аверьянова Д.В.*** Церковно-епархиальная периодическая печать как источник изучения духовно-учебных заведений Енисейской губернии (1884–1893 гг.) ... 234
***Айдунова Т.Ю.*** Организация празднования петровских юбилеев в пореформенной России (по документам министерства императорского двора и по печатным материалам) ... 237
***Олейник В.В.*** Журнал «Военный сборник» как источник для изучения деятельности военно-судебных учреждений Виленского военного округа второй половины XIX – начала XX века ... 239
***Лебедзева І.В.*** Пісьмовыя крыніцы па гісторыі дзяцінства ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ... 241
***Раманаў С.Л.*** Крыніцы па гісторыі афіцыйных святаў у гарадах Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. ... 244
***Никитина Н.П.*** Витебская губерния в воспоминаниях непременного члена землеустроительной комиссии Невельского уезда Г.М. Садовского ... 246
***Бартеле Т.М.*** Латышская пресса как источник о первом проведении «Дня Белого цветка» в Риге (1912 г.) ... 251
***Петренко А.В.*** Документы Российского государственного военно-исторического архива по вопросам управления Западным фронтом российской армии в 1915–1918 гг. ... 254
***Мизярска Н.А.*** Культура дворянского сословия Витебской губернии в мемуарных источниках начала XX века 255
***Ермалёнак В.А.*** Новыя крыніцы аб маёмасным становішчы заможных сялян Дзісеншчыны пачатку XX ст. ... 258
***Талерко В.А.*** О чём рассказывают шутки балтийских немцев ... 260

## ИСТОЧНИКИ НОВЕЙШЕГО ВРЕМЕНИ

***Дианова Е.В.*** Источники по истории культурно-просветительной деятельности северной кооперации (первые десятилетия XX века) ... 265
***Амбарцумян К.Р.*** Нарратив иностранных авторов как источник для изучения международной ситуации на Кавказе (1918–1920 гг.) ... 268
***Бараноўскі А.В.*** Крыніцы па гісторыі фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР (1919–1924 гг.) ... 270
***Филимонов А.В.*** Документы губернских съездов советов как источник по истории региона (по материалам Псковской губернии 1920-х гг.) ... 273
***Полетаева Н.И.*** Источники по истории частного предпринимательства Беларуси 1920-х гг. в фондах Государственного архива Гомельской области ... 276
***Яковлева Г.Н.*** Советские еврейские школы на Витебщине в 1920-е гг. ... 279
***Каиль М.В.*** Источники по биографике православных Новейшего времени: информационный потенциал и археографическая практика ... 284
***Танцевова А.В.*** Фотография как исторический источник по советской истории 1920-х гг. (на материалах журнала «Огонёк») ... 287
***Котович Т.В.*** Витебский кинотеатр «Рекорд» в 1920-х годах (по документам Госархива Витебской области) .. 290
***Мининков Н.А.*** Произведения советской литературы как исторический источник ... 294
***Бароўка В.Ю.*** Аповесць "Дзве душы" М. Гарэцкага як гістарычная крыніца ... 296
***Кузнецова Т.Н.*** Мифологизация политического лидера: титулатура Карлиса Улманиса в текстах его современников (30-е гг. XX в.) ... 299
***Приборович А.А.*** Материалы довоенных органов статистики как источник выяснения обстоятельств развития экономики и жизни населения БССР ... 302
***Панков Ю.В.*** Аэрофотосъёмка Гомеля 1941 года из фондов музея Гомельского дворцово-паркового ансамбля 305
***Новікаў С.Я.*** Крыніцазнаўчы патэнцыял нямецкамоўных дакументаў (на прыкладзе трафейнай калекцыі Генеральнага камісарыята "Беларусь") ... 308
***Цымбал А.Г.*** Выкарыстанне працоўных рэсурсаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў святле Калекцыі дакументаў Генеральнай акругі Беларусь ... 312
***Гребень Е.А.*** Повседневные реалии жизни белорусских крестьян в условиях нацистской оккупации (по материалам волостной администрации) ... 315

***Катионов О.Н.*** Источники для выявления боевых потерь сибиряков в период боев на территории Белорусской ССР в 1944 г. ........ 318
***Левченко В.В.*** «Спасибо Вам за память. В наши грустные дни связь с людьми ценна...»: к истории переписки В.И. Пичеты и С.И.-Я. Борового ........ 322
***Нисковская М.И.*** Многотиражная газета «За ухтинскую нефть» исправительно-трудового лагеря Коми АССР как исторический источник ........ 324
***Дьякова Е.В.*** Поощрение сотрудников Харьковского облвоенкомата к государственным праздникам ........ 325
***Афанасьева Ю.А., Козельчук Т.В.*** Проблема классификации в источниковедческом изучении писем граждан во власть (на материалах послевоенного Кургана) ........ 331
***Шкляр П.А.*** К проблеме источников по истории образования в Бигосово (вторая половина 1940-х – 1960-е гг.) 335
***Сумко Е.В.*** Самогоноварение в послевоенной белорусской деревне в дискурсе устной истории Витебщины ... 337
***Козлов А.А.*** Источники по истории местных органов политической цензуры (1953–1991 гг.) ........ 340
***Налётова Н.Н.*** Осмысление личности Петра Мстиславца в повести «Мстиславцев посох» Э. Ялугина ........ 343
***Болтрушевич Н.Г.*** Становление и развитие епархий БПЦ в начале 1990-х гг. (по материалам Национального архива Республики Беларусь) ........ 345
***Латыш Ю.В.*** Мемуары как исторический источник для написания биографии представителей высшей советской партийной номенклатуры (на примере Владимира Щербицкого) ........ 348
***Архипова Т.Г.*** Мемуары Н.И. Ельциной «Личная жизнь» как исторический источник ........ 351
***Леонтьева О.Б.*** Когда историк создает источник: современные мемуары историков как источниковый комплекс и социокультурное явление ........ 353
***Дулов А.Н.*** Воспоминания витебского историка П.В. Алексеенкова как исторический источник ........ 356
***Косов А.П.*** Закон Республики Беларусь «Об основных направлениях внутренней и внешней политики Республики Беларусь» (2005) как источник характеризующий внешнеполитическую деятельность белорусского государства на мировой арене ........ 360
***Півавар М.В.*** Крыніцы да стварэння "Зводу помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны" ........ 362

## ГУБЕРНСКИЕ УЧЕНЫЕ АРХИВНЫЕ КОМИССИИ И ИХ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ (К 110-ЛЕТИЮ ВУАК)

***Шумейко М.Ф.*** Витебская ученая архивная комиссия и ее роль в формировании экологии культуры в крае ... 366
***Давидовская О.Н.*** К истории формирования нумизматической коллекции музея Витебской ученой архивной комиссии ........ 370
***Шишанов В.А.*** Константин Змигродский – художник, краевед и музейный деятель ........ 375
***Журба О.И.*** Екатеринославская ученая архивная комиссия и формирование регионального цеха профессиональных историков ........ 379
***Колесникова М.Е.*** Ставропольская губернская ученая архивная комиссия и ее роль в развитии архивного дела на Северном Кавказе в начале XX века ........ 382
***Тарасенкова Т.И.*** Смоленская ученая архивная комиссия ........ 385
***Федосеева К.В.*** Деятельность С.И. Архангельского в Нижегородской губернской ученой архивной комиссии (НГУАК) ........ 388
***Воробьёва И.Г.*** Председатель ТУАК А.К. Жизневский – уроженец Витебской земли ........ 390
***Митрофанов В.В.*** Ученые архивные комиссии и попытки их открытия на территории Сибири ........ 393

***Сведения об авторах*** ........ 397